# Міжнародны дзень міру

Трэба адрэзаць дарогу для войнаў,

Каб чалавецтва магло жыць спайкона.

Пятрусь Броўка

21 верасня ўвесь свет адзначае Міжнародны дзень міру. Колькі ж сэнсу ў тым, чаму прысвечана гэта дата! Вельмі цяжка ўявіць сабе, як жылі б мы, калі б не было нашага Міру… Нават страшна падумаць, і нават няма жадання.

Мір… Колькі сіл было аддадзена для гэтага кароткага слова?.. З якой адвагай і мужнасцю нашы дзяды і прадзеды захавалі для нас, сваіх нашчадкаў, мір на зямлі… Наша чыстае неба, звонкі спеў птушак, свежае паветра, гаючы шум лясоў… Гэта не крыкі, не плач, не пыл, не слёзы і не жах… Гэта Мір. Дзе можна спакойна дыхаць. Тварыць. Вучыцца. Вучыць. Жыць. Гэта Мір, без якога не можа існаваць ніводная жывая істота на планеце Зямля.

Для важных рэчаў трэба вызначаць асаблівы дзень. І вельмі цудоўна, што сусвет не забывае пра тое, што кожны народ мае ў галаве і душы гэтае гучнае шчаслівае 21 верасня. У нашай школе таксама не забываюць пра гэты знакавы дзень. Штогод праводзяцца розныя мерапрыемствы, класныя гадзіны, прысвечаныя Міжнароднаму дню міру. Так, напярэдадні 21 верасня вучні 11 “В” і 10 “Б” класаў пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення свята, даведаліся пра “гарачыя кропкі” планеты, запомнілі імёны пасланцоў міру розных часоў. І на ўсё жыццё запомнілі, што, мабыць, гэта і ёсць самая важная дата для чалавецтва.

Я і мае равеснікі дакладна ведаем, што галоўны скарб чалавека – Мір. І гэты скарб павінен стаць нашай самай дарагой спадчынай.

Баюрава Валерыя Паўлаўна,

вучаніца 11 “В” класа

ДУА “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва”

+375447811787